**УДК 94 «1914/1918»**
**ДРУПОВ А.Ю., Минск**

## ФАРТЫФІКАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НЯМЕЦКІХ УМАЦАВАННЯЎ У МЯСТЭЧКУ КРЭВА

Першая сусветная вайна прынесла шмат шкоды мястэчку, насельніцтва было эвакуявана, усе хаты спалены, агароды разрыты траншэямі. Вайна пашкодзіла шмат крэўскіх помнікаў, быў разбураны касцёл Яна Хрысціцеля, які знаходзіўся ў цэнтры мястэчка, разабрана Мікольская царква, якая знаходзілася на рускіх пазіцыях, падчас летняга наступу 1917 году артылерыяй быў значна пашкоджаны Крэўскі замак. Па сутнасці пасля вайны ад Крэва засталося ўсяго 4 будынкі: замак, сінагога, міква ды царква Аляксандра Неўскага. Былі разбураны альбо пашкоджаны значныя помнікі, але культурны ландшафт Крэва атрымаў і новую групоўку помнікаў – нямецкія фартыфікацыйныя збудаванні.

Лінія фронту стабілізавалася ў раёне Крэва восенню 1915 года. У самым мястэчку яна праходзіла ўздоўж ракі Крэўлянкі, нямецкія пазыцыі знаходзіліся на правым беразе, а расейскія на левым. Абодвума войскамі былі прыстасаваны да абароны крэўскія помнікі: расейскія войскі вырылі кальцавы акоп на Юравай гары, умацаваліся ў царкве Аляксандра Неўскага, а нямецкія войскі ўмацаваліся ў Крэўскім замку, праз які непасрэдна праходзіла перадавая.

Яшчэ адным цікавым аспектам крэўскай фартыфікацыі з’яўляецца ейнае суседства з пахаваннямі, на нямецкай тэррыторыі знаходзіліся дзеючыя хрысціянскія могілкі, а на расейскай – жыдоўскія. Войскам прыходзілася суіснаваць з пахаваннямі, а ўлічваючы тое, што на вайне яны кожны дзень бачылі смерць, гэтае суіснаванне было даволі прагматычным. Так, расейскія войскі прарылі акоп прама праз жыдоўскія могілкі, а ў пабудове нямецкіх умацаванняў выкарыстоўваліся нагробкі з хрысціянскіх могілак.

Варта адзначыць, што большасць умацаванняў знаходзілася на вышынях халмоў, якія ішлі ўздоўж Крэўлянкі, такім чынам, у некаторых месцах адлегласць між расейскімі і нямецкімі пазіцыямі складала да 500 метраў, найбольш блізка варожыя пазіцыі знаходзіліся ў гістарычным цэнтры мястэчка. Нямецкія войскі займалі больш зручнае становішча, бо знаходзіліся вышэй.

Умацаванне нямецкіх пазіцыяў пачалося ў 20-х лічбах верасня 1915 году [1, с. 157], першапачаткова гэта былі драўляна-земляныя ўмацаванні. Перад першай лініяй было нацягнута 3 паясы з калючага дроту: першы на 5 калоў, другі на 7 і трэці на 5 калоў [1, с. 177], пазіцыі былі ўмацаваны цяжкімі бліндажамі, у якіх жаўнеры хаваліся ад артылерыйскага абстрэлу, прысутнічалі мінныя галярэі [1, с. 179]. Бетонныя ўмацаванні ў Крэве былі пабудаваны ў 1917 годзе, аб чым сведчаць 2 таблічкі над уваходамі ў бліндажы. Адно з умацаванняў было пабудавана ў красавіку, а іншае ў жніўні. Хутчэй за ўсё і астатнія бетонныя ўмацаванні будаваліся у 1917 годзе, але яны маглі будавацца і раней.

Пра ранейшае за 1917 год будаўніцтва некаторых кропак можа казаць іхняя канструкцыя. У Бабіным логу быў выяўлены адзін бункер з кладкай бярвення ў бетоне. Магчыма дрэва выкарыстоўвалась як апалубка, а пазней, з прывозам гофры, унутраная прастора была перабудавана. Таксмаа ўзнікае пытанне наконт часу пабудовы умацаванняў у замку.

Структурна ўмацаванні ў Крэве можна падзяліць на 3 часткі.

На поўначы Крэва, у бок выезду на Смаргонь, захавалася каля 10 ўмацаванняў, яны знаходзяцца пасярод полю, стаяць у адзін шэраг. Так як поле выкарыстоўваецца ў сельскагаспадарчых мэтах, большасць умацаванняў засыпана зямлёй. Сярод умацаванняў прысутнічаюць бліндажы ды назіральныя пункты.

Крыху на поўнач ад гістарычнага цэнтру Крэва знаходзіцца мясцовасць, якую тубыльцы называюць Бабін лог. Гэта месца з вельмі складаным рэльефам, што перашкаджае выкарыстоўваць яго ў гаспадарчай дзейнасці, чым тлумачыцца добрая захаванасць нямецкіх пазіцыяў у гэтым месцы. У некаорых частках Бабінага логу добра чытаюцца траншэі. Намі было абмерана 11 умацаванняў у Бабіным логу. Рэльеф дадзенага месца ўяўляе сабой 3 яры, якія ідуць паралельна лініі фронту, што не маглі не выкарыстаць нямецкія войскі. На схілах яраў былі размешчаны сховішчы, а на пярэднім грэбні месціліся назіральныя пункты. Таксама ў Бабіным логу прысутнічаюць 2 бліндажы з надпісамі, зробленымі ў бетоне. На першым з іх напісана:

1.M.G.K.
erbaut – aug. 1917.

што можна разтлумачыць як: “Першы кулямётны корпус. Пабудавана ў 1917 годзе”

На другой кропцы месціцца наступны надпіс (у квадратныя дужкі ўзяты адбітыя фрагменты):

[Er]baut
April 1917
Komp. D[I] Li[…]

што можна разтлумачыць як: “Пабудавана ў красавіку 1917 году. Рота D[I] палка (альбо дывізіі) ландверу”. Гэты надпіс складана дакладна разтлумачыць праз яго дрэнную захаванасць. Бачна, што яго адмыслова спрабавалі пашкодзіць, таму магчымы і іншыя тлумачэнні апошняга радку. Быў надпіс над уваходам яшчэ на аднім бліндажы, але там ён цалкам збіты, праглядаюцца толькі фрагменты літараў.

Найбольшую цікавасць выклікае выкарыстанне Крэўскага замку ў сістэме ўмацаванняў. У Малой вежы была зроблена агнявая кропка на адну амбразуру, да паўднёва-заходняй сцяны ва двары замку было прыбудавана сховішча з бутавага камяню, накрытае бетонным дахам. Бетонная муроўка прысутнічае і ва ўсходнім рагу замку. Побач з адтулінай ў паўночна-усходняй сцяне быў зроблены бетонны латок дзеля працяжкі камунікацыяў, хутчэй за ўсё тэлефона [2, с. 17]. Трусаў і саму гэтую адтуліну лічыць зробленай у Першую сусветную вайну, але, на наш погляд, адтуліна была зроблена яшчэ пры будаўніцтве замку, дзеля запуску вады ва ўнутраны двор, а ў часы Першай сусветнай вайны яна магла быць толькі разшырана. З вонкавага боку да паўночна-заходняй сцяны былі прыбудаваны драўляныя бліндажы на ўсю яе даўжыню, на версе сцяны былі зроблены назіральныя пункты, да якіх ішлі драбіны.

Першая сусветная вайна пакінула значны адбітак у гісторыі Крэва: быў істотна пашкоджаны замак, разбураны стары касцёл, змянілася насельніцтва мястэчку. Сярод сучасных жыхароў Крэва не так ужо і шмат карэнных. Але, з іншага боку, Першая сусветная вайна прынесла ў мястэчка новы пласт гісторыі.

Тое, што некаторыя нямецкія ўмацаванні знаходзяцца непасрэдна ў гістарычным цэнтры Крэва, дазваляе выкарыстоўваць іх у турыстычных мэтах. У перспектыве ў Баб’ім лозе можна будзе стварыць турыстычны комплекс, прысвечаны нямецкай фартыфікацыі. Спецыфіка ягонага рэльефу, не дазваляўшая выкарыстоўваць гэтае месца ў гаспадарчых мэтах, добра захавала не толькі бятонныя ўмацаванні, але і траншэі, што дазволіць найбольш дакладна аднавіць кавалак пазіцыяў. знаходжанне Крэва на шашы Менск-Вільня і наяўнасць у мястэчку замка забяспечыць сталы наплыў турыстаў. Да таго ж стварэнне такога комплексу не патрабуе буйных капіталаўкладанняў. Патрэбны толькі больш грунтоўныя даследванні і дазвол мясцовых уладаў.

**Литература**

1. *Лейб-Эриванцы* в Великой войне: материалы для истории полка в обработке полковой исторической комиссии. – Париж, 1959. – 246 с.

2. *Ткачев, М.А.* Исторические и архитектурно-археологические исследования Кревского замка / М.А. Ткачев, О.А. Трусов // Вопросы архитектуры Литовской ССР. – Каунас, 1988.

**УДК 623.1/.3:94 «1914/1918»**
**КАРОЗА А.И., Брест**

## ФОРТИФИКАЦИОННЫЕ СООРУЖЕНИЯ ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ. СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВНОЕ ИСПОЛЬЗОВАНИЕ

Среди множества исторических фортификационных сооружений, сохранившихся на территории Беларуси, в отдельную категорию можно выделить фортификации времён Первой мировой войны. Первая мировая или Великая европейская война на территории Беларуси и всего постсоветского пространства незаслуженно, но очень старательно забыта. А подобное вытеснение какого-либо исторического события из учебников истории и памяти народа влечёт неверное понимание или непонимание вовсе мировой истории в целом. Да, военная компания 1914-1918 гг. была Российской империей (в состав которой входили Белорусские земли) бесславно проиграна, но скорее по политическим причинам. Но в этой войне были защитники отечества, были свои герои (ведь даже если оборона отдельно взятой крепости шла два дня, это значит, защитники крепости совершили подвиг, два дня ценой своих жизней сдерживая противника). К сожалению, мы не помним своих героев, не воздаём им должную дань памяти, не заботимся об их могилах, а скорее и не знаем о них. Однако на нашей ещё земле остались немые